ужываючы эканамічны тэрмін, асноўным «актывам» нашай бібліятэкі.

Сёння Фундаментальная бібліятэка БДУ дынамічна развіваецца, мы маем канкрэтныя мэты і бачанне перспектыў. У бібліятэцы ёсць змястоўны і ўніверсальны фонд, які складае каля 2 млн дакументаў. Структура бібліятэкі максімальна адаптавана і набліжана да патрэб універсітэта, яна ўключае аддзелы па пэўных галінах ведаў непасрэдна на факультэтах. Гэта дазваляе аказваць кваліфікаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя паслугі спецыялізаванымі бібліятэкарамі, больш шчыльна супрацоўнічаць з факультэтамі. Сярод спецыфічных паслуг можна адзначыць, напрыклад, дапамогу студэнтам у распрацоўцы мадэлей і іх раздрукоўку на 3D-прынтары.

Паступова аўтаматызуюцца бібліятэчныя працэсы, у чытальных залах укараняецца прынцып адкрытага доступу да фонду, ствараюцца камфортныя ўмовы для карыстальнікаў. Бібліятэка арганізуе доступ да вядучых міжнародных навуковых баз даных, аказвае кансультацыі і дапамогу даследчыкам. Акрамя таго, у сценах універсітэта бібліятэка штогод праводзіць, без перабольшвання, сотні розных па змесце і форме мерапрыемстваў. Асаблівасцю цікавасць выклікае праца клуба аматараў мастацкага слова «Клумба» і кінаклуба «Фруза».

Сёння Фундаментальная бібліятэка БДУ з'яўляецца каардынацыйным і метадычным цэнтрам сеткі бібліятэк устаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь. На перспектыву мы бачым неабходнасць далейшай кансалідацыі намаганняў па важных напрамках дзейнасці. У планах Фундаментальнай бібліятэкі БДУ – шматлікія навуковыя і навукова-практычныя мерапрыемствы, якія паспрыяюць далейшаму абмену вопытам, апрабацыі і ўкараненню новых методык і тэхналогій.

Бібліятэка ўдзельнічае ў рэалізацыі мерапрыемстваў шэрагу міжнародных праектаў, сярод якіх – распачаты ў 2016 г. праект «Эразмус+» «Стварэнне сістэмы падтрымкі бібліятэк», дзякуючы на працягу трох гадоў будуць праведзены мерапрыемствы па мадэрнізацыі бібліятэкі і сфарміравана сучасная сістэма павышэння кваліфікацыі супрацоўнікаў універсітэцкіх бібліятэк.

Усё гэта дазваляе з аптымізмам глядзець наперад. Пры гэтым адчуваем і вялікую адказнасць, бо за нашымі плячыма – доўгая, насычаная падзеямі гісторыя і сотні чалавечых лёсаў, цесна звязаных з Фундаментальнай бібліятэкай БДУ.

Сардэчна віншуем супрацоўнікаў, ветэранаў, чытачоў Фундаментальнай бібліятэкі БДУ з надыходам юбілейнай даты – 95-годдзя з дня заснавання!

ЛІТАРАТУРА

1. **Гесь, А.** «Выслаць за межы Беларусі…» / А. Гесь // Беларуская жаночая ліга [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://belwl.org/ru/activities/books/politicheskie_repressii/a_ges/. – Дата доступу: 09.08.2016.

2. **Фундаментальная** библиотека : история и современность, 1921–2006. / [БГУ ; редкол.: П. И. Лаппо (отв. ред.) и др.]. – Минск : БГУ, 2006. – 215 с.

3. **Яноўскі, А.** Захаванне сацыяльнай памяці інтэлігенцыяй БДУ ў першыя гады яго дзейнасці (да пастаноўкі пытання) / А. Яноўскі // Крыніцазнаўства, археаграфія, архівазнаўства ў XX–XIX ст. у Беларусі : зб. арт., прысвеч. 100-годдзю з дня нараджэння М. М. Улашчыка / БДУ ; рэдкал.: С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2004. – С. 294–300.

Summary

The history of creation and contemporary activities of the Belarusian State University Fundamental Library.

**Таццяна Сапега**



**Загадчык сектара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі**

# XII МІЖНАРОДНЫЯ КНІГАЗНАЎЧЫЯ ЧЫТАННІ

7–8 красавіка 2016 г. у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбыліся XII Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні «Кніжная культура Беларусі: погляд праз стагоддзі». Мэтай канферэнцыі з'яўлялася кансалідацыя навуковай супольнасці для абмеркавання актуальных пытанняў па вывучэнні і папулярызацыі кніжнай спадчыны, для стымулявання супрацоўніцтва паміж даследчыкамі кніжнай культуры.

Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні ўжо даўно сталі адным з найважнейшых мерапрыемстваў у навуковым і культурным жыцці краіны. Тэматычнае поле канферэнцыі вылучаецца разнастайнасцю і актуальнасцю, нязменнай цікавасцю да кніжнай культуры Беларусі і асэнсавання яе феномена ў сусветным кантэксце. Кнігі, створаныя чалавечай думкай усіх часоў і народаў, на многіх мовах, у розных галінах ведаў, з'яўляюцца нацыянальным набыткам, дакументальнай памяццю грамадства і выклікаюць інтарэс у даследчыкаў і спецыялістаў розных краін. У рабоце XII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў прынялі ўдзел вучоныя з Беларусі, Венгрыі, Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Славакіі і Украіны. Шырока сфармуляваная праблематыка выклікала інтарэс у кнігазнаўцаў, лінгвістаў, літаратуразнаўцаў, культуролагаў, гісторыкаў, філосафаў, выдаўцоў і кнігагандляроў, якія прадставілі вынікі даследаванняў па гісторыі беларускай рукапіснай і друкаванай кніжнай спадчыны. Трэба падкрэсліць, што чарговая сустрэча працягнула традыцыі наладжвання прафесійнай камунікацыі, абмену досведам, прэзентацый ідэй і ініцыятыў, умацавання навуковых кантактаў.

Падчас урачыстага адкрыцця канферэнцыі намеснік Міністра культуры Аляксандр Яцко зачытаў зварот да арганізатараў і ўдзельнікаў чытанняў Міністра культуры Рэспублікі Беларусь Барыса Святлова, у якім адзначаецца, што «сёлетнія кнігазнаўчыя чытанні – адно з адметных мерапрыемстваў у рамках праводзімага Года культуры». З прывітальнымі словамі выступілі першы намеснік Міністра інфармацыі Ігар

Луцкі, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, доктар педагагічных навук, прафесар Раман Матульскі, дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар Іван Саверчанка, дырэктар Інфармацыйнага пункта Савета Еўропы ў Мінску Ларыса Лукіна.

На працягу двух дзён прайшлі пленарнае пасяджэнне, пяць секцый, пяць тэматычных блокаў, круглы стол «Еўрапейская дакументальная спадчына» і мерапрыемства «Славутыя бібліёграфы Беларусі XX ст.: А.А. Сакольчык».

Пленарнае пасяджэнне адкрыў даклад «Францыск Скарына і наш час» намесніка дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, кандыдата культуралогіі Аляксандра Сушы. У 2017 г. Беларусь будзе адзначаць 500-годдзе айчыннага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання. Гэта знакавая дата звязана з дзейнасцю Францыска Скарыны – выдатнага дзеяча беларускай культуры, які сёння з'яўляецца яе сімвалам. У дакладзе праз асэнсаванне рэчавых артэфактаў было прадэманстравана, што вобраз першадрукара трывала ўвайшоў у сучасную культурную прастору.

Тэма 500-годдзя беларускага кнігадрукавання была вядучай у дакладах і абмеркаваннях удзельнікаў XII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў. У рамках тэматычнага блоку «Вытокі беларускага кнігадрукавання: падыходы да святкавання юбілею» прагучалі шматлікія даклады, прысвечаныя беларускаму першадрукару Францыску Скарыне, а таксма адбывалася абмеркаванне падыходаў да святкавання юбілея беларускага кнігадрукавання, якое стане выключнай падзеяй у культурным жыцці Беларусі ў наступным годзе. Гэтым важным пытанням былі прысвечаны даклады «Францыск Скарына: дыскурсы з біяграфіі» галоўнага навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, дацэнта, доктара гістарычных навук Георгія Галенчанка, «Перспектывы святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання ў Полацку» дырэктара Музея беларускага кнігадрукавання Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка Алены Шумовіч (Полацк), «Онлайн-ресурс «Книга Беларуси XIV–XVIII вв.»: от идеи к реализации» загадчыка аддзела фарміравання электроннай бібліятэкі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Віктара Пшыбыткі і інш.

У рамках Кнігазнаўчых чытанняў адбылося адкрыццё выставы «Францыск Скарына і наш час», арыентаванае на папулярызацыю асобы Скарыны і разлічаная на шырокую аўдыторыю. На выставе экспанаваліся матэрыялы са збораў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь (філіял «Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры», філіял «Музей гісторыі беларускага кіно»), Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны, гімназіі № 1 імя Ф. Скарыны г. Мінска, Полацкай дзяржаўнай гімназіі імя Ф. Скарыны, кавярні «У Францыска», прыватных калекцыянераў. Наведвальнікі атрымалі магчымасць акунуцца ў сучасны свет успрымання сімвалаў і вобразаў беларускага першадрукара, адшукаць яго пазнакі ў прадметах побыту, у школьных аксэсуарах, у студэнцкай і ўвогуле маладзёжнай субкультуры, у асяродку навукоўцаў і калекцыянераў, карпаратыўнай атрыбутыцы, у мастацкім ўвасабленні тэатра і кіно. На выставе дэманстраваліся прадметы, з якімі мы сутыкаемся кожны дзень і з якіх на нас паглядае Скарына: кубкі, майкі, маркі, медалі, банкаўскія карткі і нават завушніцы.

У пленарным дакладзе «Библиотека, архив, музей: наукотворческое призвание» галоўнага навуковага супрацоўніка комплекснага навуковадаследчага аддзела Усерасійскай дзяржаўнай бібліятэкі замежнай літаратуры імя М.І. Рудаміна, доктара гістарычных навук Яўгенія Рашкоўскага (Масква) быў зроблены важны аналіз спецыфічнага свету бібліятэк, музеяў і архіваў з пазіцый сучаснага тэарэтычнага навуказнаўства. Гэты спецыфічны свет разглядаўся аўтарам у двух ракурсах: як неадменны дэпазітарый памяці ўласна-навуковых і гуманітарных ведаў, якія пастаянна развіваюцца, і як жыццёва неабходная для навукі платформа інтэлектуальнай камунікацыі.

Пленарны даклад «Каталог книг из библиотеки короля Сигизмунда II Августа в фондах Российской национальной библиотеки в Санкт-Петербурге» ад'юнкта аддзела гісторыі бібліятэк і чытання Нацыянальнай бібліятэкі Польшчы, доктара Томаша Шваціньскага (Варшава) быў прысвечаны каталогу, выдадзенаму ў 2015 г., які з'яўляецца вынікам шматгадовага супрацоўніцтва паміж нацыянальнымі бібліятэкамі Польшчы і Расіі.

У пленарным дакладзе «Зборнік «Брэсцкая Біблія – унікальны помнік культуры XVI стагоддзя»: да 450-годдзя выдання» старшы навуковы супрацоўнік аддзела старадрукаў і рэдкіх выданняў Нацыянальнай бібліятэкі Украіны імя У.І. Вярнадскага, кандыдат гістарычных навук Ірына Цібароўская-Рымаровіч (Кіеў) прадставіла выданне, прысвечаныае Брэсцкай альбо Радзівілаўскай Бібліі 1563 г. Сама даследчыца прыняла ўдзел у складанні бібліяграфічнага паказальніка матэрыялаў пра Брэсцкую Біблію, які з'яўляецца часткай зборніка.

У пленарным дакладзе «Беларуская мова як эстэтычны дэтэрмінант і сродак дэмакратычнай парэнезы ў друкаваных выданнях XIX ст.» прафесарам кафедры гісторыі беларускай літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктарам філалагічных навук, дацэнтам Жаннай Некрашэвіч-Кароткай былі зроблены высновы, што мастацкая фактура і змястоўныя асаблівасці беларускамоўных твораў XIX ст. выяўляюць імкненне іх аўтараў зрабіць мову эстэтычным дэтэрмінантам, рэлевантным у культурнай прасторы Беларусі (асабліва ў другой палове XIX ст.), а таксама найбольш прыдатным сродкам выхаваўчага ўздзеяння на чытача з асяроддзя сярэдняй і дробнай шляхты.

Загадчык аддзела Нацыянальнай бібліятэкі Славакіі Янка Дропкава (Марцін) у пленарным дакладзе «The original and translated Belarusian literature in book collection of Slovak National Library» расказала аб дзейнасці сваёй бібліятэкі і прадставіла агляд прысутнасці беларускай кнігі XX–XXI стст. у яе фондзе.

Пасля пленарнага пасяджэння ўдзельнікі форума працягнулі сваю працу на наступных секцыях і тэматычных блоках:

Секцыі:

«Рукапісныя помнікі і архіўныя дакументы як крыніцы даследавання гісторыі і культуры Беларусі»

«Традыцыі беларускай кніжнай культуры XIX–XX стагоддзяў»

«Перспектывы выдавецкай дзейнасці і кніжнага гандлю»

«Кніжная спадчына Беларусі XVI–XVIII стст.»

«Гістарычныя кнігазборы. Даследаванне правенецый»

Тэматычныя блокі:

«Вытокі беларускага кнігадрукавання: падыходы да святкавання юбілею»

«Мастацтва кнігі»

«Перыядычны друк. Беларускі эмігранцкі друк»

«Кніга ў музейнай прасторы. Віртуальныя кніжныя выстаўкі»

«Роля і месца кнігі ў сучасным інфармацыйна-камунікацыйным асяроддзі. Футурыстычныя прагнозы будучыні кнігі»

У секцыях і тэматычных блоках прынялі ўдзел шматлікія беларускія і замежныя даследчыкі і спецыялісты, якія разгледзілі пытанні гісторыі беларускай кніжнай культуры, ролі кнігі ў сучасным інфармацыйна-камунікацыйным асяроддзі і далі прагнозы будучыні кнігі.

Удзельнікі пасяджэння круглага стала «Еўрапейская дакументальная спадчына», які быў арганізаваны пры падтрымцы Савета Еўропы, абмеркавалі праблемы захавання і ўвядзенне ў навуковае і грамадскае абарачэнне еўрапейскай дакументальнай спадчыны, намецілі шляхі актывізацыі міжнароднага супрацоўніцтва па распрацоўцы і рэалізацыі праектаў, накіраваных на выяўленне, захаванне і сумеснае выкарыстанне дакументальнай спадчыны.

Мерапрыемства «Славутыя бібліёграфы Беларусі XX ст.: А.А. Сакольчык» было прысвечана беларускаму бібліёграфу Адаму Антонавічу Сакольчыку, аўтару першай універсальнай бібліяграфіі «Дооктябрьская книга на русском языке о Белоруссии».

Са зместам дакладаў можна азнаёміцца ў зборніку матэрыялаў XII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў, які быў падрыхтаваны і выдадзены да пачатку канферэнцыі. У зборнік увайшло 80 артыкулаў [1].

На падвядзенні вынікаў удзельнікі мерапрыемства адзначылі актуальнасць і важнасць правядзення канферэнцыі, прысвечанай гісторыі і сучаснасці нацыянальнай кніжнай культуры. Мерапрыемства дае магчымасць падзяліцца вынікамі навуковых пошукаў, што ў далейшым спрыяе наладжванню навуковага дыялогу і супрацоўніцтва паміж даследчыкамі розных краін. Удзельнікі падкрэслілі таксама тое, што ў вывучэнні праблем кніжнай культуры застаецца яшчэ шмат прабелаў, ад чаго значнасць заяўленых тэм толькі ўзрастае. У кожнай секцыі адбывалася гарачая дыскусія па розных праблемах, ставіліся сур'ёзныя пытанні і прапаноўваліся новыя нестандартныя варыянты іх вырашэння. Удзельнікамі неаднаразова адзначалася, што штогадовыя Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні застаюцца адной з лепшых канферэнцый сярод форумаў аналагічнай тэматыкі і выступаюць для даследчыкаў і практыкаў крыніцай перспектыўных ідэй і праектаў.

ЛІТАРАТУРА

1. **Матэрыялы** XII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў «Кніжная культура Беларусі: погляд праз стагоддзі», Мінск, 7–8 красавіка 2016 г. / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; складальнікі: Т. А. Сапега, А. А. Суша. – Мінск, 2016. – 375 с.

Summary

The information about the XII International Bibliological readings.

**Ірына Царук**

**Дырэктар Навагрудскай раённай бібліятэкі**

# Трэція Шчорсаўскія чытанні

28 мая ў Шчорсах, былых уладаннях асветніка і гуманіста Яўхіма Храптовіча праводзіліся Трэція Шчорсаўскія чытанні па тэме «Публічныя бібліятэкі на Гродзеншчыне: стан і перспектывы даследавання». Чытанні сталі знакавымі для Навагрудчыны ў Год культуры, бо адзначаны гістарычнымі, культурнымі, нацыянальнымі прыярытэтамі. Пачатак чытанняў быў тэатралізаваны і вельмі яркі. Галоўнай на сцэне была кніга. Калегам, работнікам клубных устаноў удалося спалучыць гісторыю, вобразнасць, рыцарскі паедынак і танец вельмі ўдала, каб раскрыць усе каштоўнасці Навагрудчыны. Жыхароў і гасцей Шчорсаў віталі начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Навагрудскага райвыканкама Марына Шабановіч, намеснік дырэктара Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага Марына Ігнатовіч, старшыня Шчорсаўскага сельскага Савета Генрых Лукоўскі.

Вельмі грунтоўнымі аказаліся выступленні калег аб гісторыі бібліятэк Свіслачы, Гродна, Ліды. Як адзначыў у сваім дакладзе кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы Амелька Сяргей Уладзіміравіч, менавіта па ініцыятыве мясцовай інтэлігенцыі ў Беларусі яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. пачалося стварэнне грамадскіх публічных бібліятэк, якое атрымала больш шырокае распаўсюджванне ў пачатку 1860-х гг. У бібліятэках Гродзеншчыны пераважалі польскія і французскія выданні, набывалася прагрэсіўная для таго часу літаратура. Пасля паўстання 1863–1864 гг. шэраг грамадскіх бібліятэк быў закрыты. Аднак пад уплывам грамадскасці царскія ўлады вымушаны былі ў канцы 1860-х гг. пайсці на прадастаўленне некаторых дэмакратычных свабод, у тым ліку на адкрыццё публічных бібліятэк.

Самай старэйшай бібліятэкай Беларусі лічыцца Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага. Матэрыялы архіваў сведчаць, што рашэнне аб яе адкрыцці было прынята ў верасні 1830 г. на нарадзе ў гродзенскага губернатара Міхаіла Бабяцінскага. Першым бібліятэкарам быў прызначаны Міхаіл Зялёнка, прэфект Гродзенскай гімназіі. У 1886 г. пры Гродзенскай публічнай бібліятэцы адкрыўся кабінет для чытання. Цікава, што ў 1892 г. бібліятэку ўзначаліў бацька паэта Максіма Багдановіча – Адам Ягоравіч, вучоны, педагог і грамадскі дзеяч. Намеснік дырэктара Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага Марына Ігнатовіч паведаміла яшчэ і аб асноўных шляхах